# * Практыкум да ўводзін

## 1. Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

Перыядызацыя гісторыі — гэта ўмоўны падзел гістарычнага працэсу на пэўныя храналагічныя перыяды (перыяды гісторыі). Гэтыя перыяды маюць адметныя асаблівасці, якія вызначаюцца ў залежнасці ад абранай падставы (крытэрыю) перыядызацыі. Для перыядызацыі могуць абірацца розныя падставы.

Напрыклад, у сусветнай гісторыі вылучаюць перыяды гісторыі Старажытнага свету, гісторыі Сярэдніх вякоў, гісторыі Новага і Навейшага часу. Вы вывучалі гэтыя гістарычныя перыяды на ўроках сусветнай гісторыі ў 5–9 класах.

**А.** Абапіраючыся на засвоеныя веды або выкарыстоўваючы электронныя версіі вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі для 5–9 класаў, размешчаныя на Нацыянальным адукацыйным партале, запоўніце табліцу «Перыядызацыя сусветнай гісторыі».

**Перыядызацыя сусветнай гісторыі**

| Перыяды сусветнай гісторыі | Храналагічныя рамкі | Падзеі, якія паслужылі пераходам да наступнага перыяду |
|---|---|---|
| Гісторыя Старажытнага свету | | |
| Гісторыя Сярэдніх вякоў | | |
| Гісторыя Новага часу | | |
| Гісторыя Навейшага часу | | |

**Б.** Успомніце, на якія перыяды дзялілася гісторыя Сярэдніх вякоў. Назавіце храналагічныя межы гэтых перыядаў.

**В.** Аб якой заканамернасці гістарычнага развіцця можна зрабіць вывад на падставе табліцы?

## 2. Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

Перыяды ў гісторыі Беларусі вылучаюць у адпаведнасці з дзяржаўнымі ўтварэннямі, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі: дадзяржаўны перыяд, першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі (Полацкае і Тураўскае княствы), Беларусь у складзе ВКЛ (Рэчы Паспалітай), Беларусь у складзе Расійскай

імперыі, БССР, Рэспубліка Беларусь. Вы вывучалі гэтыя перыяды на ўроках па гісторыі Беларусі ў 6–9 класах.

**А.** Абапіраючыся на засвоеныя веды або выкарыстоўваючы электронныя версіі вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для 6–9 класаў, размешчаныя на Нацыянальным адукацыйным партале, запоўніце табліцу.

**Перыядызацыя гісторыі Беларусі**

| Перыяды гісторыі Беларусі | Храналагічныя рамкі | Падзеі, якія паслужылі пераходам да наступнага перыяду |
|---|---|---|
| Дадзяржаўны перыяд | | |
| Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі | | |
| Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага (Рэчы Паспалітай) | | |
| Беларусь у складзе Расійскай імперыі | | |
| Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР) | | |
| Рэспубліка Беларусь | | |

**Б.** Суаднясіце перыядызацыі айчыннай і сусветнай гісторыі. Зрабіце вывад.

## 3. Адрозненне факта ад меркавання

Гістарычная навука грунтуецца на фактах і імкнецца выявіць заканамернасці развіцця чалавечага грамадства. Варта адрозніваць гістарычны факт і яго інтэрпрэтацыю.

Паняцце «факт» паходзіць ад лац. *factum* — дзеянне, зробленае. *Гістарычны факт* — гэта рэальнае дзеянне, што адбылося ў мінулым. Гістарычны факт аб'ектыўны і лакалізаваны ў часе і прасторы. Спецыфіка гістарычнага факта заключаецца ў тым, што яго немагчыма паўтарыць, скапіраваць.

У гістарычных даследаваннях мы кажам пра *навукова-гістарычны факт* — вынік разважанняў вучонага-гісторыка, рэканструкцыі факта, заснаванай на слядах, пакінутых мінулым. Вучоны-гісторык аднаўляе (рэканструюе) гістарычны факт, г. зн. апісвае тое, што адбылося раней,

на падставе гістарычных крыніц. Пры гэтым ён іх аналізуе і крытычна ацэньвае.

## Віды гістарычных фактаў

*Падзеі* — гэта дакладна лакалізаваныя ў часе і прасторы адзінкавыя, непаўторныя факты. Напрыклад, бітва пры Нямізе (1067 г.).

*З'явы* — гэта агульныя факты, якія шматразова паўтараюцца, без прывязкі да канкрэтных людзей. Напрыклад, «паншчына».

*Працэсы* — гэта ланцугі фактаў, выбудаваныя на падставе прычынна-выніковых сувязей; заканамерныя, паслядоўныя змены станаў чагосьці; займаюць працяглы прамежак часу. Напрыклад, «запрыгоньванне сялян».

**А.** Прывядзіце 2–3 прыклады падзей, з'яў, працэсаў з сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі. Сваё меркаванне аргументуйце.

*Інтэрпрэтацыя гістарычных фактаў* — гэта тлумачэнне гістарычных фактаў, надзяленне іх сэнсам. Гісторыкі, як правіла, інтэрпрэтуюць факты зыходзячы з тых ці іншых тэорый гістарычнага працэсу. Інтэрпрэтацыя гістарычных падзей, з'яў і працэсаў ажыццяўляецца людзьмі, таму з'яўляецца суб'ектыўнай, хоць пры гэтым можа адпавядаць крытэрыям навуковасці. Тут важна ўлічваць, на якія факты і канцэпцыі абапіраецца гісторык.

Інтэрпрэтацыі заўсёды павінны быць лагічна абгрунтаваны і аргументаваны, абапірацца на ўстаноўленыя факты. Яны не павінны супярэчыць ніякім іншым выяўленым фактам.

Калі меркаванні не аргументаваныя, абапіраюцца не на факты, а на якія-небудзь іншыя меркаванні (не заснаваныя на фактах) або супярэчаць іншым фактам, то гэта з'яўляецца бяздоказным меркаваннем, маніпуляцыяй.

Інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў могуць быць розныя. Адзін і той самы факт можа па-рознаму ўспрымацца сучаснікамі падзей і нашчадкамі, гісторыкамі. Гэта можна растлумачыць, таму што ў адрозненне ад сучаснікаў падзей гісторыкі ўжо ведаюць, «што здарылася потым».

Адзін і той самы факт можа інтэрпрэтавацца як значны і нязначны ў залежнасці ад мэт даследавання, маштабаў перыяду, які вывучаецца, прыналежнасці гісторыка да пэўнага навуковага кірунку.

**Б.** Прачытайце апісанне бітвы на Нямізе ў «Аповесці мінулых гадоў» і «Слове пра паход Ігараў», выканайце заданні.

*З «Аповесці мінулых гадоў»:*

*«У год 6575 (1067). Пачаў міжусобную вайну Усяслаў Полацкі, сын Брачыслава, і заняў Ноўгарад. Трое ж Яраславічаў: Ізяслаў, Святаслаў, Усева-*

*лад, — сабраўшы вояў, пайшлі на Усяслава ў моцны мароз. І падышлі да Мінска, і мінчане зачыніліся ў горадзе. Браты ж тыя ўзялі Мінск і перабілі ўсіх мужоў, а жонак і дзяцей захапілі ў палон і пайшлі да Нямігі, і Усяслаў пайшоў супраць іх. І сустрэліся праціўнікі на Нямізе месяца сакавіка ў 3-і дзень; і было шмат снегу, і пайшлі адны на адных. І была сеча жорсткая, і многія палі ў ёй, і адолелі Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад, Усяслаў жа збег. Пазней, месяца ліпеня ў 10-ы дзень, Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад, пацалаваўшы крыж святы, сказалі Усяславу: „Прыйдзі да нас, не ўчынім табе ліха“. Ён жа, спадзеючыся на іх крыжацалаванне, пераехаў да іх у ладдзі цераз Дняпро. Ізяслаў першы ўвайшоў у шацёр. І так схапілі Усяслава, парушыўшы крыжацалаванне. Ізяслаў жа, прывёўшы Усяслава ў Кіеў, пасадзіў яго ў цямніцу з двума сынамі».*

*З «Слова пра паход Ігараў»:*

*«На Нямізе снапы сцелюць галавамі, малоцяць цапамі булатнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела. Нямігі крывавыя берагі не дабром засеяны, засеяны касцямі рускіх сыноў».*

1) Факты ці меркаванні выкладзены ў дадзеных крыніцах? Прывядзіце аргументы.

2) Што агульнага ў апісанні бітвы на Нямізе ў дзвюх крыніцах? Пацвердзіце сваё меркаванне цытатамі.

3) Як аўтары тэкстаў ставяцца да міжусобнай вайны паміж рускімі князямі? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

4) Складзіце артыкул «Бітва на Нямізе» для «Энцыклапедыі юнага гісторыка», абапіраючыся толькі на прыведзеныя дзве крыніцы.

## 4. Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

Галоўны гонар Рэспублікі Беларусь — гэта людзі. Наша краіна па праве можа ганарыцца таленавітымі вучонымі, пісьменнікамі і паэтамі, асветнікамі, мастакамі і музыкантамі, спартсменамі, касманаўтамі і інш.

**А.** Складзіце топ-5 выбітных айчынных вучоных, што аказалі істотны ўплыў на станаўленне гістарычнай навукі ў нашай краіне.

**Б.** Знайдзіце інфармацыю пра сферу навуковых інтарэсаў вучоных-гісторыкаў — аўтараў дадзенага вучэбнага дапаможніка. Як іх прафесійная дзейнасць уплывае на развіццё гістарычнай адукацыі?

**В.** Якім чынам, на вашу думку, гістарычныя даследаванні ўплываюць на нашу сучаснасць і будучыню?